Мікола Маляўка

# БЯЖЫЦЬ АДВЕЧНАЯ ДАРОГА

*Вершы*



***Маляўка Мікалай Аляксандравіч*** нарадзіўся 13 снежня 1941 года ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (1965). Настаўнічаў у вясковых школах. Працаваў на Рэспубліканскім радыё і тэлебачанні, у часопісе «Вясёлка».

Аўтар паэтычных зборнікаў «Едуць маразы» (1966), «Лотаць» (1973), «Эстакада» (1982), «Аднавякоўцы» (1988), «Зімні дождж» (1991), «Ручнічок на крыжы» (1995), «Покуць» (2001), «Сядзіба, або Хата з матчынай душой» (2002), «Старая зямля» (2005), «Ой, бярозы і сосны...» (2006), «Дзічка ў полі» (2007), «Крыштальная галінка снегападу» (2011), «Беражыце шыпшыну» (2013), «Нябесны фатограф» (2016), «Раманс на два галасы» (2018), «Сланечнік» (2018), кніг вершаў і казак для дзяцей «Дзед і ўнучка» (1983), «Салодкі лядзяш» (1986), «Як дом будавалі» (1987), «Дзе жывуць казкі» (1994), «Запрашаем на калядкі» (1998), «Папялушка» (2000), «Пачынайце дзень з усмешкі» (2013) і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова (1992), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1997), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (2002), Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2019).

## ЗРАЎНЯЛІСЯ З ЗЯМЛЁЙ, ЯК ЦАЛІНА...

Зраўняліся з зямлёй, як цаліна,
Равы, зямлянкі — з франтавой прапіскай,
Магілы брацкія — без абеліскаў.
І ўсё ж не забываецца яна,
Вялікая Айчынная вайна:
З крывёй, слязьмі і чалавечым прыскам —
Пакут і страт зямных жалобным спіскам.
На цэлы свет трагедыя — адна.

Я з вогненных гадоў, вайны равеснік,
І сам ужо даўно на ціхай пенсіі.
З малітваю і крыжыкам святым
Пайду ад вас я, дарагія людзі,
Але і ў вечнасці, на свеце тым,
Вайна душу маю трывожыць будзе.



ПРОЗА

**Уладзімір Гаўрыловіч**

# ЛЮБІ БЛІЖНЯГА ТВАЙГО...

*Раман-версія. Заканчэнне.*
*Пачатак у №7—8 за 2023 г.*

*Працяг рамана-версіі «Па веры вашай...», першая частка якога друкавалася ў «Полымі» ў № 5—7 за 2022 г.*

## ІДЗІ СВАЁЙ ДАРОГАЙ...

*Частка дзясятая*

### 1

Ніхто не ведаў дакладна, што з Алісавай здарылася. З ранку была ж здаровая, не скардзілася нікому... Ці, можа, самлела яна ад невыносна спякотнага Божага кола? Пра душэўны боль старой адзінокай жанчыны князевы лекары, вядома, не маглі нічога сказаць. Усе чакалі, што яна памрэ.

Дзесяць дзён Алісава ляжала ў сваёй святліцы. Не ела, не піла. Толькі ж памерці ў тыя апошнія дні лета ёй Гасподзь не даў. Нечакана для ўсіх, як злегла, так і вярнулася да жыцця, і яшчэ праз тыдзень княгіня-маці акрыяла і пачала ўставаць з ложка. Жыццё яе працягвалася ў доўгіх малітвах.

Калі надвор'е змянілася — спякота рэзка спала ды пайшлі зацяжныя дажджы, а днямі і начамі было яшчэ даволі цёпла, — з блізкага густога бору да яе ў пакой данёсся прэлы грыбны пах. І як толькі Алісава добра адчула яго, павесялела, папрасіла каб да яе прыбылі сын Святаполк і ўнучкі Збыслава і Прадслава.

Нявестку Алену Алісава не хацела бачыць, хаця яна яе парадавала: нарэшце зацяжарыла і насіла доўгачаканае дзіця, — Ізяслава і яе род доўжыўся на гэтай зямлі!

Яна павіншавала сына з гэтым, радавалася з ім. Мякка выгаварыла Святаполку тое, што доўга зараней абдумвала: князі разбураюць Рускую зямлю паборамі… Выгаварыла і заклікала сына спыніць міжусобіцу паміж імі, раіла зноў сабраць іх на перамовы і аб'яднацца супраць палавецкай пагрозы, якая нікуды не знікла, не мінула. Шмат бедаў ад качэўнікаў усім. Вось і Пячэрскі манастыр, які яна апекавала, ніяк не адновіцца пасля апошняга разбуральнага набегу…

Святаполк выслухаў маці моўчкі і не стаў спрачацца з ёю. Гэта яе ўсцешыла. Далей княгіня паведаміла навіну: прыйшло нарэшце адабрэнне Папы Рымскага на шлюб яе ўнучкі, дачкі Святаполка Збыславы і польскага караля Баляслава III.

І як блаславенне ад бабулі, якая, па-сутнасці, замяніла Збыславе маці, тая атрымала яе малітоўнік з ушытымі ў яго лістамі і мініяцюрамі. (Праз вякі знакаміты рукапіс тураўскай і кіеўскай княгіні, які займеў яшчэ назву Кодэкс Гертруды, ператварыўся ў рэліквію адразу некалькіх еўрапейскіх каралеўскіх дамоў.) Акрамя гэтага, абедзве ўнучкі атрымалі ад Алісавы прыгожыя папярэдне асвечаныя ў некалькіх храмах залатыя лунніцы з крыжыкам пасярэдзіне: княгіня працягвала закладзеную некалі мужам Ізяславам традыцыю…

У 6610-м (1102-м ад Нараджэння Хрыстова) дачка кіеўскага князя Святаполка стала жонкай польскага караля. Хутка яе сястру Прадславу таксама засваталі за венгерскага каралевіча.

Адпусціўшы задаволеных унучак, княгіня перахрысціла і пацалавала тройчы, сказаўшы ім:

— Ідзіце, дзеці мае, сваёй дарогай. Ды не забывайцеся, чаму вучыла вас старая Гертруда-Алісава. Не забывайце, з якога вы роду-племені. Ды шануйце і памятайце зямлю, якая вас узгадавала.

Калі ж яны выйшлі, прамовіла ўслед: «Святы Пётар, пашлі ім шчасця і веру ісцінную ў Госпада нашага адзінага», — і перахрысціла дзверы, за якімі яны зніклі…

## 2

Здавалася, яшчэ ўчора княгіня-маці развітвалася з жыццём, а лекары ў адзін голас цвердзілі, маўляў, не сёння, дык заўтра сыдзе яна ў Невараць, рыхтуйся, княжа, — але ж не — акрыяла!

Вялікі князь Святаслаў рэдка так старанна маліўся, чакаючы кожны дзень набліжэння канца сваёй маці. У думках сваіх ён звяртаўся да бацькі-нябожчыка Ізяслава, братоў Яраполка і Мсціслава, якія так рана пакінулі грэшную зямлю. Па ўзросце ён, Святаслаў, выходзіла, ужо дасягнуў бацькавых гадоў і значна перажыў сваіх братоў. Думаў, які канец яго чакае, бо ўсе яны памерлі не сваёй смерцю. Згадаў і пра Еўдакію. Нічога не вядома пра яго адзіную малодшую сястру… Пэўна, невясёлы і яе лёс, калі даўно не падавала ніякай весткі. А княгіня Алісава, ведаў, звялася ў перажываннях — дачка ёсць дачка, па прыродзе так, бліжэй сыноў дзяўчынка сваёй маці… Кажа Алісава: ці не ў манастыры якім па волі Пястаў са зменёным імем жыве сястра і дачка? Куды ж ёй было дзецца, калі звялі ворагі юнага Мешку?..

У гэткіх успамінах-думах перажываў свае новыя дні Святаполк. Шкадаваў старую княгіню: маці ж, хоць часам і раздражняла яна князя. Але — адзіны родны чалавек, які не жадаў яму кепскага. Толькі дабра. Яна ж жыццё яму падаравала. Хаця нехта са зласліўцаў плётку пусціў: не яна яго раджала… Ён жа ведае сваю маці! Кажуць, што непадобны на яе, ні характарам, ні дзеямі… Дык сын пераймае і бацькава, і мацярынскае… Людзі-шэльмы!..

Не наведваўся вялікі князь ў яе святліцу, але цікавіўся ў лекараў штодня: што з ёй і як? Тыя толькі паціскалі плячыма, апусціўшы галовы. І раптам — такое незвычайнае выздараўленне. Гэта можна было чакаць ад яе, маці! Хаця, прызнацца, было, надзея пакінула і яго. А сёння, калі старая Алісава зусім ачуняла і паклікала сям'ю да сябе, каб блаславіць не толькі Збыславу — тая днямі адпраўлялася ў Кракаў да будучага мужа, ды знайшла цёплыя словы для яго сына (Алена, нарэшце, панесла ад яго), ды і меншай яго дачцэ Прадславе шмат чаго ад бабулі перапала, — гэта ўсё надта ўзрушыла раней малавернага князя.

«Ёсць Бог на зямлі!» — думаў Святаполк, калі дочкі сышлі са святліцы княгіні-маці.

# 3

Княгіня доўга падбірала патрэбныя словы. Святаполк зразумеў, што яна хоча з ім пагаварыць сам-насам, таму і затрымаўся. Алісава цяжка ўздыхнула і папрасіла сесці з ёю побач, на край ложка. Вялікі князь паслухаў маці. Чакаў, што будзе далей.

— Сынок... — ціха пачала Алісава, уважліва зазірнуўшы сыну ў вочы, і на хвіліну змоўкла.

Святаполку аж заняло дыханне, калі адчуў жудасны адчай і невыносны боль, які зыходзіў цяпер ад маці, старой жанчыны. Не сказаў, але ліхаманкава падумаў: што ж цябе так гняце, што не толькі вочы, а і ўвесь твар, рукі, цела трывогу тваю выдаюць? А толькі што, пры дзецях, выглядала зусім здаровай, вясёлай нават. Што за незразумелыя пераўтварэнні?

— Сынок...— паўтарыла гэтак жа ціха і спакойна маці-княгіня. — Я рада, што ты так проста ўпершыню прыйшоў да мяне. Як у дзяцінстве, зусім маленькім ты прыбягаў, каб пацалаваць сваю маці…

— Не мог не прыйсці. Я хваляваўся за цябе… Маці ў мяне адна, другой не будзе, — гэтак жа ціха адказаў Алісаве Святаполк і ўсміхнуўся. — Рады, што ты папраўляешся…

— А ты старэеш… Гадкамі роўны ўжо свайму бацьку-нябожчыку. Жыві доўга, сын. І будзь шчаслівы. Гэта галоўнае, бо на смяротным адры не будзе што ўспомніць. Шчасце — гэта галоўнае, што для князя, што для смерда. Адзін раз жывём на свеце. І шчасце князева, калі радзіма твая дагледжаная. Памятай тое, што раней сказала. А я хутка сыду… Нямнога мне засталося кірпець.

— Чуе маё сэрца, выхоўваць будзеш. Зноў? — засмяяўся сын. Такая яго шчырасць парадавала маці.

— Не буду, родны. Не буду. Але прызнаюся: трымае на гэтай зямлі мяне адно…

Яна змоўкла, не дагаварыла, заплюшчыла вочы.

— Калі не пра княства і не пра твой Тураў, то тут застаецца толькі адно: Еўдакія… — спакойна прамовіў вялікі князь, здагадаўшыся пра што будзе размова.

Княгіня здзіўлена шырока расплюшчыла вочы:

— Як ты мог здагадацца?

— Проста. Ведаю сваю маці. Сэрца тваё баліць… І мне балюча таксама: сястра — родная кроў…

— Так, так сынок. Ты бачыў: Збыславе, як сваёй старэйшай унучцы, я перадала свой малітоўнік. Тыя пергаменты Ізяслаў, бацька твой гарэмны, мне набыў некалі, а я дапаўняла яго сваімі малітвамі. Ну і не толькі малітвамі.

— Бачыў. Збыслава рада твайму падарунку. Яна — набожнае дзіцё…

— А як ён у мяне зноў апынуўся, калі некалі я аддала яго Еўдакіі, блаславіла такім чынам на вянчанне?

— Як? Пачакай… — не зразумеў князь.

— Малітоўнік мне назад вярнуўся. Праз шмат гадоў… Мае праклятыя польскія родзічы звялі са свету не толькі Мешку, але і нашу Еўдакію.

— Дакладна ведаеш?

— Тая атрута, якую трэба было б, каб падзялілі між сабой князь Уладзіслаў Герман і яго палацін Сецех, па іх волі дастаўся маёй дзяўчынцы. Тваёй сястры. Яны забілі яе, разумееш? Не пашкадавалі дзіця маё, што кроў у нас з імі амаль адна… Ненавіджу! Праклінаю іх. Бязвернікі! Аднаго ўжо пакараў Бог! Няхай душа Уладзіслава не знойдзе нідзе супакаення!.. Але і Сецеху не жыць! Пракляты зводнік! Тураян, прымі Бог душу гэтага светлага чалавека! Ён выканаў волю вер-

нага нам баярына Івана: перарэзаў горла таго вылюдка Вроцлава, які іх волю чыніў, што маці родная не пазнала і адмовілася ад цела сына свайго — загніў нягоднік на беразе Віслы…

Алісава зайшлася ў плачы.

Вялікі князь быў ашаломлены: якое гора зноў прыйшло ў яго сям’ю! Бедная, бедная яго маці!.. Ён упершыню за ўсё жыццё абняў яе, прыхіліў да сябе, а яна сутаргава плакала, не магла супакоіцца. Вялікі князь плакаў разам з маці, але без слёз. (Потым ён будзе дакараць сябе за такую праяўленую слабасць, але цяпер яны былі адным цэлым: маці і сын…)

## 4

— Ведаеш, мой дарагі, што напісала сваёй рукой перад згубай у маім малітоўніку наша Еўдакія? Я пакінула сабе… — крыху супакоіўшыся, сказала Алісава. — Вазьмі, прачытай.

Вялікая княгіня працягнула сыну кавалак жоўтага пергаменту. «Не думаць трэба, а сцвярджаць веру ў сэрцах людскіх. Дабрыню не павінна выцесніць зло…» — па складах прачытаў князь і задумаўся.

Сын доўга маўчаў. Нарэшце спытаў.

— Яе магіла ў Кракаве?

— Не, сынку. Мы нічога не ведалі… Чатырнаццатая зіма прыйдзе, як ляжыць яна ў Тураве-градзе. Адзінокая, забытая, пакінутая. Дачушачка мая ясная… За магілкаю сёстры манастырскія, кажуць, наглядаюць. Не ведаючы, чыя насамрэч і магілка тая. Побач з саборам, па волі бацькі твайго, светлая яму памяць, збудаванага… Паабяцай, як полаўцы сыдуць, храм той аздобіць, каб, як Сафія Кіеўская, высіўся над той зямлёю!.. Паабяцай, сыне. Больш і прасіць не буду. Хіба…

Яна змоўкла, дапытліва паглядзела на сына.

— Будзем жыць — спраўджу волю тваю, — сказаў ён, гледзячы на маці. — Пашлю да пасадніка ў Тураў-град майстровых ды мастакоў знаных. За сонцаварот справяцца… Вы нешта яшчэ хацелі, княгіня-маці?

— Мне з Польшчы вестка прыйшла…

— Якая?

— Таксама пра Еўдакію.

— Кажыце.

— Перад смерцю Мешка аб’явіў усім, што яго жонка — цяжарная.

— Што?

— Наша Еўдакія насіла дзіця. Магчыма, спадчынніка кароны.

— За што і паплацілася, бедная…

— Так, сынок. Яе забілі мае праклятыя родзічы. Звяры, звяры…

— Не вернеш, маці. Не вернеш. Нам трэба жыць, на добрае спадзявацца.

— Так, родны. Але ж… Чуе маё сэрца: магла паспець Еўдакія нарадзіць дзіця.

— Глупства… Гэта вашы трызненні…

— Не, не глупства. Я падлічыла, прыкладна па часе супадае. Магла даць жыццё сыну ці дачушцы.

— Мы б гэта ведалі. Столькі часу мінула…

— Але сведкі маглі застацца. Баярына Івана няма. Так, хаваў ён яе. Не ўратаваў. Але ж дапамагаў яму нехта. У Тураў трэба слаць верных людзей, шукаць трэба… Сэрца маці не падманвае. Можа, дзе жыве мой унук ці мая ўнучка, твой пляменнік ці твая пляменніца…

— Калі гэта праўда, то... Пашлю віжуна, няхай параспытвае.

— А я ў кожны храм кіеўскі да лета буду ездзіць, за супакой душы Еўдакіі нашай службы закажу, колькі летаў ёй — столькі і храмам ахвярую на малітвы.

— За службу ігумені тураўскай, што апякуе магілу сястры, таксама трэба аддзячыць. Срэбра і злата на манастыр не перашкодзіць...

— Пашлі, сыне. Богаўгодная справа. Ігумення тая баганосіцай сапраўды стала, а некалі ж ложак з тваім бацькам дзяліла...

— Вы так спакойна пра тое кажаце? — здзівіўся князь.

— Было — травой парасло. Мы з ёй нават пасябравалі, як Ізяслава не стала. Яна ж баярскага роду, цётка баярына Івана.

Пра тое, што Тураян нарадзіўся ад тых любошчаў яе мужа і ігумені княгіня прамаўчала.

— Тады і сям'і гэтага ратніка, нябожчыка Тураяна трэба што...

— Дапамажы, сынок. Настаяцельніца ведае, дзе іх знайсці. Але галоўнае, нам упэўніцца трэба, пра Еўдакію: як і што было на самай справе...

— З Божай дапамогай, княгіня, усё адкрыецца.

— З Божай, сынок!

## 5

Старая княгіня не скарылася. Яна як магла напаміНала неразумнаму сыну пра яго святы абавязак — дбаць пра зямлю Рускую і люд яе. Шмат міжусобіц не здарылася, бо княгіня-маці таемна, не баючыся непрыяцеляў яго, прасіла за стольны Кіеў і зямлю Рускую. Чакаючы свайго сыходу з жыцця, параўноўвала свайго сына з малодшым унукам Яраслава Мудрага чарнігаўскім князем Уладзімірам Манамахам. І стала не на бок сына, які не трымаў сваё слова, што даваў часта братам сваім, што разам трэба выступаць супраць палавецкіх набегаў, больш займаўся непатрэбнымі звадкамі, амаль не дбаў пра ўмацаванне Русі і вызваленне яе ад ворага.

Толькі не ўсё залежала ад княгіні-маці. Святаполк быў катэгарычны, увогуле доўга выступаў супраць ваенных паходаў. Ды і дружыны яго надта не хацелі ваяваць. Праўда і тое, што рэдка сталі на нівах чуваць галасы сейбітаў у тыя гады, усё больш на палях крумкачы выдзіралі вочы ды звяры абгрызалі косці забітых нявінных людзей, а дарогі кішэлі рабаўнікамі...

Княгіня-маці ў малітвах за няладнага сына прасіла ў Сына Божага ды святога Пятра ратавання сваёй зямлі. Яна ўсім сэрцам прыняла пазіцыю чарнігаўца, бо толькі яму ўдавалася не раз пераканаць кіеўскага князя і іншых князёў спустошанай Русі да аб'яднання ў адну моцную дзяржаву: словы Уладзіміра не раз паўтарала Святаполку: «Перш чым сеяць, варта ўмацаваць межы, калі ж не — ворагі зруйнуюць вёскі і спаляць пасевы...»

І па волі Бога у наступным 6611-м (1103-м ад Нараджэння Хрыстова) годзе здарылася радасць вялікая: нарэшце князі Кіеўскай Русі аб'ядналіся супраць палавецкіх ханаў.

На працягу сямі зім і летаў ішлі сечы паміж полаўцамі і рускімі воямі, і ў кожнай новай бітве русічы атрымлівалі перамогу за перамогай. Набегі качэўнікаў надоўга спыніліся, на Русі мірна сеялі жыта.

А яна, княгіня-маці, малілася ва ўсіх храмах за вояў зямлі Рускай. Яна ведала, хто пераможа. Ведала ўжо не з кніг, не з малітваслова: спрадвечна русічы, як ніхто іншы, умелі даравацьь. Нічога русічы не забывалі. Але даравалі. Дзеля будучыні. Яна спрыяла, каб слава пра іх сыноў ішла па ўсім свеце. Бо баганосцы

яны, і заўсёды змагаліся за праўду. Верыла і малілася за народ свой, часткай якога стала сама...

…А пошукі Еўдакіі нічога не далі…

## 6

У сарака храмах Русі да самага Святога Вялікага Дня ў вясну 6611-га (1103-га ад Нараджэння Хрыстова) чыталіся памінальныя малітвы па бясчасна згаслай сястры вялікага князя Святаполка і адзінай дачцэ маці яго, Алісавы. На ўсе царкоўныя службы, калі ёй дазваляла здароўе, прыязджала вялікая княгіня. І яна тады малілася не па-лацінску, як у большасці бывала раней, а па праваслаўным каноне, прасіла ў Заступніка:

«Помяни, Господи Боже наш, в вере и надежди живота вечнаго преставльшуюся рабу Твою Евдокию и яко Благ и Человеколюбец, отпущаяй грехи, и потребляяй неправды, ослаби, остави и прости вся вольная ее согрешения и невольная, избави ее вечныя муки и огня геенскаго, и даруй ей причастие и наслаждение вечных Твоих благих, уготованных любящым Тя:

аще бо и согреши, но не отступи от Тебе, и несумненно во Отца и Сына и Святаго Духа, Бога Тя в Троице славимаго, верова, и Единицу в Троице и Троицу во Единстве, православно даже до последняго своего издыхания исповеда.

Темже милостив тому буди, и веру, яже в Тя вместо дел вмени, и со святыми Твоими яко Щедр упокой:

несть бо человека, иже поживет и не согрешит.

Но Ты Един еси кроме всякаго греха, и правда Твоя, правда во веки, и Ты еси Един Бог милостей и щедрот, и человеколюбия, и Тебе славу воссылаем Отцу и Сыну и Святому Духу, ныне и присно, и во веки веков. Аминь».

Блізка да таго часу, адразу пасля Вялікадня, нечакана, не скардзячыся нікому на хворасці свае, спачыў блажэнны ігумен Іаан. З Кіева-Пячэрскага манастыра прыйшла вестка: памёр іх настаяцель пасля вячэрняй малітвы, прыхіліўшыся да святых мошчаў свайго настаўніка Феадосія. Там, у велічным храме, раніцай знайшлі яго цела.

## 7

У прызначаны дзень у сабор Успення Прасвятой Багародзіцы наехала шмат епіскапаў, чарняцоў і мірскіх людзей. Са сваёй світай прыбыў туды і вялікі князь Святаполк. З Чарнігава прыскакаў з невялікаю дружынай князь Уладзімір.

Алісава на адпяванне ігумена дабралася пазней за ўсіх…

Спачатку думала і не ехаць зусім, адчувала сябе нядобра ўжо некалькі дзён. Аднак загадала сабе трымацца і ўсё ж выбралася ў манастыр. Не магла не прыехаць, бо шмат Іаан добрага зрабіў для Бога і для людзей праваслаўных. А для яе, лічыла, — больш чым для каго: кірпеў старанна і трудна над першым рускім летапісам-зводам, пачатым яшчэ ігуменам Ніканам, а яна падахвочвала абодвух як магла.

Той самы малады інак, што прыслужваў настаяцелю Кіева-Пячэрскага манастыра пры іх апошняй сустрэчы, сустрэў яе якраз па дарозе да галоўнага ўваходу ў сабор. Пакланіўся. Папрасіў прабачэння. Пасля паведаміў княгіні-маці важнае…

І вось што гэта было… Ігумен, напярэдадні свайго сыходу, вельмі чакаў Алісаву ў саборы. Нібы адчуваў што. Ды так і не дачакаўся. Парываўся паслаць гэтага інака да княгіні, ды, мабыць, давяраў не кожнаму. Не кож-

ны са служак Божых можа трымаць язык за зубамі, а яму трэба было слова ў слова перадаць тое, што не давала спакою душы ігумена. Толькі ёй, княгіні-маці, у той дзень таксама пачало нездаровіцца. Яна зусім не спала. Калі прачнулася, балела ўсё цела, і яна мала хадзіла па святліцы, бо нібы ветрам хістала яе ў розныя бакі, баялася ўпасці. Таму і не асмелілася ехаць, знаходзячыся ў такім стане. Седзячы ў адзіноце, малілася ў сваёй святліцы святому Пятру...

Інак яшчэ паведаміў, што ў келлі айца Іаана знайшоў ліст, пісаны ім для «мати Святаполковъ». І, пакланіўшыся, перадаў пасланне тое Алісаве...

## 8

Каля храма было нямала ўбогіх жабракоў, што прасілі міласціну, і проста разявак: не кожны дзень пабачыш у адным месцы самых багатых людзей княства. А тут такая падзея! Інакі адганялі іх ад уваходу, але тыя проста так, асабліва жабракі, не сыходзілі. У храм больш нікога не пускалі.

Княгіня-маці падняла вочы ўгару, на залатыя купалы, тройчы перахрысцілася і пакланілася. Нечакана перад уваходам у сабор яна сустрэлася вачыма з светлагаловым высокім юнаком. Алісава спынілася, уважліва паглядзела на яго. Падалося: дзіўна знаёмы светлы твар, вочы вялікія, напорыстыя, але добрыя, з сіняй павалокай. І чамусьці сумныя-сумныя...

Блізіўся поўдзень. Напоўніцу свяціла Божае кола, шчодра саграваючы вясенняе паветра. Княгіня звярнула ўвагу, што гэты хлопчык — амаль юнак — быў у цёплым авечым кажушку, расшпіліў гузікі. Палатняныя штаны і кашуля ёй паказвалі, што хлопец не тутэйшы. Яшчэ не прабіліся вусы, толькі ўбіраецца ў мужчыну, не больш чатырнаццаці летаў яму, або, можа, і таго меней. І вочы. Такія знаёмыя вочы...

Жабракі і многія зявакі кінуліся прасіць міласціну:

«Падай, княгіня-маці... Падай, спадарыня...»

## 9

Яна не шкадавала — медзякі заўсёды для такіх выпадкаў трымала пры сабе.

Цалавалі, слюнявілі рукі. Ёй, аднак, гэта было брыдка. Але што зробіш? І гэты хлопчык-юнак, адчула, спачуваў ёй — адвярнуўся. Брыдка і яму было, што так ганебна паводзяць сябе кіяне.

Нешта яе, Алісаву, павяло прама да яго, прыцягнула сілай. І тут, прыўзняўшыся на чарговую прыступку, зноў зазірнула ў яго вочы — такімі роднымі яны ёй здаліся, хоць заплач тут! Што ж з ёю такое адбываецца? Нягодна гэта для княгіні-маці!.. А ён, здзівілася, не працягваў руку — не чакаў ад вялікай княгіні міласціны. Усміхаўся толькі — так усміхаюцца добрым знаёмым, родным, блізкім. Ды неяк мякка, па-свойску сказаў:

— Вы прыгожая, княгіня. Як мая маці...

Яна была зачараваная: вочы яго свяціліся радасцю і нейкай загадкай.

— Цябе як завуць, хлопча?

— Іванам нараклі.

— Адкуль будзеш?

— Здалёку я... Адтуль, дзе шмат балот і азёраў...

— На самай справе ведаеш, хто я? — усміхнулася, чамусьці узрадаваўшыся, Алісава.

— Вы — вялікая княгіня... Вас любяць у нашым Тураве-градзе.

— Здалёку дабраўся. Што ты тут робіш? — цікавасць яе ўзрастала.
— Прывёз футра, скуры на продаж. Добры гандаль у Кіеве…
— А бацькі твае хто?
— Сын лоўчага я… Ігнацыем майго бацьку звалі. А як воем быў — Тураянам… Памёр бацька мінулым летам. Я за галаву ў сям'і цяпер…

Алісава знямела. Успомніла ўсё. Але вочы ў Тураяна іншыя. Памятала добра. Можа, у маці ўдаўся гэты сын былога адважнага ратніка?

Княгіня адчула, як з яе і гэтага хлопчыка не зводзяць вачэй інакі і манахі. Нават праз адчыненыя дзверы сабора сталі кідаць цікаўныя позіркі. Аднак ёй так хацелася яшчэ пагаварыць з гэтым юнаком, які воляй лёсу апынуўся тут і так хораша напомніў ёй пра шчаслівую яе маладосць у далёкім лясным і балотным краі. Але яна не магла столькі часу гаварыць з бедняком…

У патаемным месцы свайго ўбора княгіня знайшла адчаканеную манету яе сына, вялікага князя Святаполка. Гэта была першая сынава манета, асвечаная ў Сафійскім саборы, якую ён падарыў на шчасце сваёй маці. Шмат летаў Алісава не развітвалася з ёю, берагла яе нібы шчаслівы талісман. Малілася на яе, каб усё добра было ў сына на стале кіеўскім…

Рашэнне прыняла імгненна, бо не жадала Івану меддзю, як іншым, міласціну падаць, сорамна было б ёй перад амаль земляком з Тураўскай зямлі, сынам адважнага воя. З лёгкасцю на душы працягнула яму срэбра:

— У святым месцы на вякі ты, Іване, знаходзішся. Унукі і праўнукі твае, магчыма, праз сотні сонцаваротаў тут маліцца будуць, праўды шукаць. Верую. Хай беражэ цябе Гасподзь і Святая Багародзіца. Будзеш ты шчаслівы, Іване, дзе б ні быў. Ідзі сваёй дарогай…

У вачах юнака, такіх вялікіх, з сіняй паволокай, здалося, загарэлася святло, нібы Божае кола заглянула ў іх. І яна, Алісава, нібы ў душу яго глянула — чыстую, шчырую. Разгублены Іван нізка пакланіўся княгіні. А ёй трэба было ісці, куды і належала…

## 10

Алісава старанна малілася за ігумена Іаана, які толькі што сышоў у нябыт. Малілася за таго, хто усё ж неблагім быў чалавекам і духаўнікам многіх вернікаў. Малілася і за сям'ю сваю, пералічваючы тых, хто сышоў з жыцця і хто жыве. Яна знайшла асаблівыя словы — прасіла ў Святой Багародзіцы за страчаную дачку. Прасіла ў Бога і за сына свайго, князя кіеўскага, каб дараваў яму грахі, бо на яго ў кіян вялікія спадзяванні. Малілася, а з галавы ніяк не выходзіў хлопчык-юнак, якога сустрэла на ганку сабора. І раптам Алісава змоўкла… Яе малітва перарвалася нібы сама па сабе — княгіня неадрыўна пазірала на свечку: з памяці выплыў той самы ранішні сон, які дагэтуль ніяк не мала разгадаць…

…Сцежка ў зялёным лесе… Шырокія промні Божага кола высвятляюць праз густы туман старыя дубы, белыя бярозы. Ветрык яшчэ не прачнуўся… Нехта схіліўся да грудка зямлі... Пакуль ён яшчэ не мужчына. Але бязвусы юнак, які толькі ўбіраецца ў мужчынскую сілу. Статны, прыгожы хлопчык. Трынаццаці, можа чатырнаццаці, не больш, летаў і зім яму… З сумам у вачах ён пазірае на ўзыход Божага кола. Потым нібыта ўглядаецца скрозь яго… Да болю знаёмыя яго вочы… Вялікія, з сіняй паволокай, і сумныя-сумныя вочы. У каго такія яшчэ? Чорныя дугападобныя бровы, нос з гарбінкай… Хто ён? Што гэты юнак-падлетак тут, сярод дзікага лесу, робіць?..

Паўсюль балоты, чорныя балоты. Шмат вады, якая чарней, чым колер кары старога дуба… Шыракаплечы, каранасты той дуб галінамі нібы дастае неба.

Нямала вякоў ён пераўжыў, шмат чаго пабачыў. Магіла пад ім, на высокім пагорку. Злосны крумкач-вястун паміж жыццём і смерцю — на дубе тым. Звысоку пазірае, нібы вывіжоўвае сваю ахвяру. Святы Пётр!!! Юнак-падлетак плача… Ён вымушаны хаваць ад людзей сваю няўцешнасць. Чаму? Нехта дарагі яму пад дубам тым ляжыць… Па ім — плача? Хто закапаны ў свежы дол?..

«Божа, я ж бачыла гэтага хлопчыка ў сне…» Ёй хацелася крыкнуць пра гэта на ўвесь сабор.

— Княгіня-маці, з вамі ўсё добра? Напалохалі мяне. Вы то збялелі, то ваш твар наліўся чырванню, — каля Алісавы апынуўся вялікі князь Святаполк. — Можа, лепей — дадому?

— Нічога, сынок. Не хвалюйся. Усё добра. Я крыху знервавалася. Іаан добры быў да нас, царствіе яму нябеснае…

— То, можа, усё ж лепей на паветра выйдзеце? — прапанаваў маці Святаполк. — Тут ужо няма чым дыхаць…

— Не турбуйся. Я сама, сынку. Сама… Будзь тут. Ты — вялікі князь. На цябе ўсе глядзяць, — адказала яна.

Княгіня не азіраючыся паспяшалася да выхаду. Здзіўленыя позіркі кідалі на яе кіяўляне, але яна не звяртала на іх ніякай увагі.

Апынуўшыся на ганку сабора, рэзка спынілася, вышукваючы сярод натоўпу таго самага юнака, з якім нядаўна пазнаёмілася. Толькі яго ўжо тут не было. Вялікім было яе расчараванне: так хацела яшчэ з ім пагаварыць.

Манахі, якія стаялі на ўваходзе, прапанавалі ёй адпачыць у прыхрамавай прысадзе. Там можна напіцца вады і пачакаць, пакуль у саборы закончыцца развітанне з настаяцелем манастыра.

…Пахавалі ігумена Іаана ў той самай пячоры, з якой некалі ён вынес мошчы свайго настаўніка Феадосія. Як вынеслі з сабора дамавіну яго, вялікая княгіня ўстала і адсюль, молячыся, развіталася з ім. Не магла нікуды крануцца: толькі што прачытала апошняе ёй пасланне Іаана.

З яго высноў, пакладзеных у роўныя радкі на пергаменце, выходзіла: юнак-хлопчык, якога прысніла, і гэты Іван, які шануе памяць лоўчага і лічыць за бацьку Тураяна-Ігнацыя, сын яе дачкі Еўдакіі. Іаан прасіў тураўскую настаяцельніцу, каб прыслала Івана, сына Ігнацыева, менавіта ў гэтыя дні да манастырскай святыні. І той, мала ведаючы, чаму, хаця ж, хутчэй за ўсё, распавялі яму ўсё, чаму ён тут, выканаў тую просьбу Іаана. Мабыць, цікава і яму было паглядзець збоку на радню сваю: вялікага князя — дзядзьку і вялікую княгіню — бабулю…

Пастарэлая княгіня Алісава на зыходзе свайго жыцця зразумела яшчэ адну простую рэч: калі не прызнаўся ёй Іван, хто ён такі на самай справе, то добрага сына сабе выхаваў той ваяр Тураян. Як і бацька яго названы, выбраў Іван сабе з Божай дапамогай не княжы, што па крыві, а просты шлях у жыцці. Трэба яшчэ падумаць, хто цяпер, у гэты смутны час, больш шчаслівы?

І яна шчасліва ўсміхнулася, удзячна зірнуўшы на блакітнае неба і на залатыя купалы вялікага сабора: усё ж Гасподзь спрычыніў, каб яна пабачыла, каго хацела перад смерцю сваёй пабачыць. У малітвах і думках сваіх яна падтрымала выбар унука.

Бо яго права так жыць. Яго жыццё.



ПАЭЗІЯ

# Анатоль Зэкаў

# ПРАХОДЗЯЦЬ ДНІ, ПРАХОДЗЯЦЬ ТЫДНІ...

*Вершы*

***Зэкаў Анатоль Мікалаевіч*** нарадзіўся 20 студзеня 1955 года ў вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт ГДУ. Працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк», у Гомельскім райкаме камсамола і ЦК ЛКСМ Беларусі, у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Добры вечар», «Сталіца», «Книга и мы», «Беларуская лясная газета», часопісаў «Вожык», «Полымя», «Вясёлка», у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Аўтар звыш сарака кніг паэзіі і прозы. Лаўрэат літаратурных прэмій імя Янкі Маўра Мінскага гарадскога аддзялення СПБ і імя Васіля Віткі рэдакцыі часопіса «Вясёлка», прэміі «Залаты Купідон». Ганаровы грамадзянін Буда-Кашалёўскага раёна.

## ДЗВЕ ЗГАДКІ З МАЛЕНСТВА

**1.**

Шмат гадоў —
нібы туманаў —
ўжо сплыло з пары тае,
як гулялі ў партызаны
я й равеснікі мае.

У атаку мы ляцелі
стрымгалоў, на ўсіх парах,
крапівою шамацелі —
рукі й ногі ў пухірах.

Гэта так было даўно.
Ды й цяпер —
каму ў віну? —
пахнуць рукі палыном,
як ад пораху ў вайну.





# Алесь Ветах
# ДВА АПАВЯДАННІ

***Алесь Ветах (Бельскі Алесь Іванавіч)*** нарадзіўся 23 ліпеня 1963 года ў мястэчку Цімкавічы на Капыльшчыне. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1986). Доктар філалагічных навук, прафесар.

Аўтар кніг прозы «Ружовая знічка» (1994), «Хроніка смутку» (1999), «Сны пра дзяцінства» (2014), «Хрыстос між нас» (2015).

Пад уласным прозвішчам выдаў вершаваны зборнік «Між маладзіком і ветахам» (2018). У 2021 годзе пабачылі свет кніга-перакрутка «Летуценні і цені» (паэзія) і «Лібрэта лета» (мікрапроза).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа (2000).

Выступае як літаратуразнавец і крытык.

## ТАЯМНІЦА ПРЫВАТНАЙ ТРАГЕДЫІ

Мы з Рычардам ехалі на радзіму сябра — у азёрна-лясны і, як раней часта называлі гэты прасторава-тэрытарыяльны абсяг, партызанскі край. З навіслых шэрых хмар церусіў дробны восеньскі дождж. Абапал шашы мільгалі таўстаствольныя разлапістыя хвоі, касматыя елкі і сціплыя танклявыя бярозкі, якія прысуседзіліся ў засені старых велічных дрэў пасля высечкі і будаўніцтва новай дарогі. Вёз нас на сябраву радзіму Рычардаў зяць — малады караткастрыжаны чарнявы хлапчына, які моўчкі круціў руль і сачыў за дарогай.

Наш сябра Толік быў сынам былога падпольшчыка і партызана, а яго маці ў гады вайны ў партызанскім лагеры пякла хлеб, а потым вучыла дзетак у лясной школцы. Мы з Рычардам мала што ведалі пра Толікавых бацькоў, неяк гаворка пра іх рэдка калі заходзіла. У маладых, натуральна, усялякіх размоў хапае, але не заўсёды яны гавораць пра сямейнае, згадваюць тое ўчарашняе, што звязана з роднымі, блізкімі людзьмі, а хтосьці і свядома не кранае тэму бацькоў, а то і нешта ўтойвае, не жадаючы, каб іншыя ведалі пра мінулае жыццё, як там і што было. Бо па-рознаму і па-свойму складваецца ў сем'ях, адносіны паміж бацькамі і дзецьмі бываюць, мякка кажучы, далёка не ідэальнымі.

Напэўна, у Толікавай сям'і ў час яго дзяцінства і ранняга юнацтва ўсё было добра, па-людску. Праўда, пра бацьку ён не згадваў. Найчасцей сябар з незвычайнай цеплынёй апавядаў пра сваю матулю, якая ў школе была яго першай настаўніцай, а галоўнае, пра што неаднойчы казаў Толік, яна цудоўна спявала. Яе спевы на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці пачуў знакаміты дырыжор, народны артыст і быў у вялікім захапленні, запрасіў у свой харавы калектыў, але тая, гадуючы дваіх дзетак-дашкалят, адмовілася. І сам Толя прыгожа спяваў, меў мяккі грудны голас, прытым густы, насычаны, сакавіты. У школе на выпускным вечары ён упершыню спяваў разам з матуляй. Ён часта выступаў на нашай факультэцкай сцэне: і як выканаўца народных песень, і як чытальнік вершаў улюбёнага паэта Караткевіча, і як вядоўца беларускіх вечарын. «А памятаеш, як Толік спяваў?» — парушаючы нядоўгае маўчанне, раптам папытаў Рычард і правёў указальным пальцам па запацелай бакавой шыбе аўто. У адказ я толькі сцвярджальна хітнуў галавою, бо, зразумела, як можна было забыць яго спяванне, яго дзівосны, кранальны голас, які, лунаючы ў нашым студэнцкім пакоі, хваляваў і зачароўваў. Міжволі ў памяці выяўна ўсплыў вобраз-аблічча сябра, з вуснаў якога лілося, імкнулася з грудзей, нібы на споведзі, журботна-сумнае, тужлівае і поўнае горычы. У той момант здавалася: праз песню ён выказвае штосьці сваё, вельмі асабістае, ды такое горкае, шчымлівае, несуцешнае — аж сэрца рвецца:

Забалела ды мая галованька,
Забалела галава.
Гэй! Гэй! Гэй! Забалела галава.

А што ж будзе, калі з той галованькі,
Можа, я памру, памру?
Гэй! Гэй! Гэй! Можа, я памру, памру?..

Толя ў параўнанні з намі, сваімі аднакурснікамі, быў хлопец ужо досыць сталы, сур'ёзны, удумліва-разважны. Паступіў ён ва ўніверсітэт пасля так званага ПА — падрыхтоўчага аддзялення, да гэтага адслужыў два гады ў войску. Усе мы трое жылі ў адной, кажучы на рускі капыл, «абшчазе» — інтэрнаце, што ва ўніверсітэцкім гарадку. Называлі мы сябра Толь або Толік, ён клікаў мяне Лесь, а Рычард быў для нас Рыча. Толя меў прыгожую, артыстычна фотагенічную ці, як цяпер кажуць, мадэльную знешнасць. На фотаздымках ён нібы галівудская зорка ці нейкі каралеўскі прынц. Абліччам сваім ну ніяк Толік не выдаваў на прыгажуна-маладзёна з глухогаляснога краю. Наш сябар любіў і ўмеў з густам апранацца, стрэлкі на старанна адпрасаваных ім нагавіцах заўсёды былі вострыя, нібы напаказ, здавалася, што яны блішчэлі. Напэўна, ён, калі б дужа захацеў, то мог быць яркім і фантастычна папулярным кінаакцёрам, меў бы шалёны поспех у глядацкай жаночай публікі. Маючы досыць высокую, амаль спартыўную, паставу — за метр восемдзесят, Толік выдатна, шыкоўна глядзеўся, а гамонячы з дзяўчатамі, трымаўся як сапраўдны кавалер і джэнтльмен. Што і казаць, хлопец гожы, статны, спрытны і відны, а яшчэ на рэдкасць далікатны і шляхетны. Такі адразу заўважны для дзявочага вока, гэткі любой паненцы галаву закружыць. Трэба было якой-небудзь дзяўчыне пачуць хоць разочак, як ён спявае ці чытае вершы на памяць, — і можна было лічыць, што яна трапіла ў палон яго чараў і сэрца яе ўжо не здолее проста так выбавіцца з гэтых цянётаў падсвядомага паклікання-пачуцця.

Але здарылася інакш: наш красун Толік сам па вушы закахаўся ў першакурсніцу Светку — неверагодна прыгожую светлавалосую дзяўчыну з пухнаценкімі бялёсымі вейкамі і тонкімі броўкамі. Яна выглядала на цацачную вялікую

ляльку, з якой хацелася гуляць-забаўляцца і адразу прыхінуць да сябе. Збягаючы па лесвічных сходках у лёгкай ружовай сукенцы, яна, быццам прынцэса на кінаэкране, адразу зачаравала Толіка, усхвалявала ды так узрушыла, што ён дзівіўся ўслед пабачанай красе. І дзявочае прозвішча Светка мела адпаведнае свайму хараству і гожасці — Харошча. Толік імгненна загарэўся жаданнем пазнаёміцца з гэтай пекнай дзяўчынай і ўжо неўзабаве на дыскатэцы, у суботу, выглядзеў яе сярод аднакурсніц, запрасіў на павольны танец. Калі ён першы раз правёў Светку, а жыла яна ў іншым універаўскім інтэрнаце, то, вярнуўшыся радасным і ўзнёслым, прыгаворваў: «Харошча дык Харошча! Проста слоў няма... Самы мілы ўнікум на свеце. Больш такой Харошчы, такога хараства не стрэнеш, не знойдзеш!» Нацешыцца не мог Толік гэтай мілай дзяўчынай, найпрыгожай ружай, сапраўднай каралеўнай у страката-яркім кветніку незвычайнага хараства.

Няцяжка здагадацца, як Толік заваёўваў дзявочае сэрца, выклікаючы прыязнасць, сімпатыі, намагаючыся закахаць у сябе: спяваў, чытаў вершы, а яшчэ круціўся на турніку, робячы «сонейка» — тут яму не было роўных, бо ў войску атрымаў добрую фізічную вывучку. Зрэшты, ён ад факультэта часта ўдзельнічаў у лёгкаатлетычных спаборніцтвах: досыць хутка бегаў. Аднак больш за ўсё любіў турнік, на якім з лёгкасцю падцягваўся пад трыццаць разоў. У параўнанні з сябрам, мы з Рычардам, прызнаюся шчыра, былі слабакі.

Дзіва дзіўнае: дзяўчаты-красуні на нашым курсе ўздыхалі і аж млелі, захапляючыся прыгажосцю Толіка і яго спевамі, шмат хто з іх хацеў, а то і прагнуў быць у ягоных абдымках, а ён не зважаў на тых, хто бліскучаю вужакаю віецца побач, лагодна пазірае і ціха гаворыць, быццам закалыхвае, каб хлопец неприступнасць і пільнасць страціў, ласкава ўсміхаецца, робіць недвухсэнсоўныя гарэзлівыя намёкі, у думках хоча з пяшчотай прытуліцца. Нашаму сябру цяпер было не да іншых, не да аднакурсніц, абранніцай яго стала Светка Харошча — зусім яшчэ юная і светлая, чыстая, як вясновая раніца, дзяўчына, на прыгажосць якой ён глядзеў з любасцю ў вачах, а мо і проста быў ашаломлены, асляплены яе неверагоднай, нейкай незямной дзівоснасцю і хараством. «Мая Харошка», «Мая Харошачка», «Мая Харашулька», — казаў Толік пра дзяўчыну, не хаваючы ад нас свайго захаплення і замілавання, не саромеючыся гэтых воклічаў-эмоцый і пяшчотных слоў. Збіраючыся на спатканне, ён старанна галіўся і ў прыўзнятым настроі мурлыкаў пад нос, а яшчэ радасна, весела выспеўваў, заклікаючы тую адзіную, самую цудоўную дзяўчыну, пра якую ці не ўвесь час думаў і якую гарэў жаданнем як мага хутчэй пабачыць:

Ох, выйдзі, выйдзі,
Ох, выйдзі, выйдзі,
Выйдзі, выйдзі да мяне ты,
Мая Харашуха.

І так, здавалася, будзе спяваць без сунімку, бясконца, паўтараючы-круцячы адно і тое ж. Але Толік, навёўшы стрэлкі на нагавіцах і наадэкалоніўшыся, выходзіў, дакладней, куляй вылятаў з інтэрната, бег-імчаў-ляцеў, нібы хуткі птах, на прызначанае месца сустрэчы са сваёй Светкай. І гэтыя спатканні яшчэ, напэўна, доўжыліся б і мелі працяг. Бо, здавалася, яны з павелічэннем частотнасці і з цягам часу перацякуць або перарастуць у доўгі спаткальны марафон. Аднак адносіны між закаханымі развіваліся хутка, інтэнсіўна, надзвычай бурна і вокамгненна дасягнулі свайго піку.

І што нас, Толікавых сяброў, дзівіла: Светка, летуценна-наіўная і даверлівая першакурсніца, якая лёгка магла сарамліва пачырванець ад нашых шпілек,

вольных намёкаў, раптам нібы памянялася ці яе падмянілі, пачала выглядаць больш сталай: мо таму, што рабіла эфектныя пышныя прычоскі з хвалістымі пасмачкамі, з густам апраналася ў стыльныя, модныя сукенкі — здавалася, адмыслова сшытыя для яе ці ўзятыя дзесьці напракат. Так ці інакш, яна быццам пераймала вобраз чароўнай кінаакцёркі, трымалася нязмушана, больш смела, не ўспрымала жарты-кпіны з нашых вуснаў пра заляцанні сябра і яго намеры як нешта непажаданае і непрыгожае, не бянтэжылася і не чырванела, а проста шчыра, а то і залівіста смяялася, выдаючы чалавека вясёлага, жыццярадаснага, шчаслівага.

Не паспелі мы прызвычаіцца да захопленых ахаў і мройліва-салодкіх уздыхаў Толіка, як той агаломшыў нас, сваіх сябрукоў, весткай: ён жэніцца. Не сказаць, каб гэта было абсалютна нечакана, хутчэй, прадказальна, а мо і непазбежна, але што гэта так хутка адбудзецца — мы, шчыра кажучы, не чакалі, не меркавалі. Неўзабаве наш сябар Толік павёў васямнаццацігадовую красуню ў белай шлюбнай сукенцы ў сталічны ЗАГС, дзе іх абвясцілі мужам і жонкаю ды паставілі ў пашпартах штампік, зрабіўшы адпаведную пазнаку.

Студэнцкае вяселле гулялі ў заводскай сталоўцы, дзе зала на цэлы вечар стала нашай — замовіць яе мы хадзілі разам з Толікам. Дарэчы, цётка Рычарда ў той сталоўцы працавала на касе. Імпэту, запалу для шумнай вясельнай бяседы-пагудкі і гарэзлівых скокаў хапала, маладая энергія біла цераз край. Пілося, усмак елася і ўсім добра гулялася. Што цікавае: на вяселле прыйшоў куратар нашай студэнцкай групы Віктар Антонавіч Забеліч, якога Толік наважыўся і паклікаў быць за свата. Тут трэба зрабіць агаворку: вяселле ж ладзілася ў той савецкі час, і хоць нейкіх старых народных традыцый мы тады імкнуліся ўсё ж трымацца. Запомнілася, як ён, трымаючы келіх з шампанскім, прамаўляў тост: «Ведаеце, мы захапляемся прыгожымі і маляўнічымі краявідамі. З асалодай сузіраем ранкам ружова-залаты бляск неба, радуемся яркай вясёлцы пасля дажджу, успрымаем ціхую ноч з россыпам зорак як чарадзейную казку... Захапляемся прыродай, навакольнымі з’явамі і цудамі. І гэта добра, і гэта слаўна. Сёння я гляджу на гэтых прыгожых маладых людзей, узіраюся ў іх зграбныя паставы, хаду і рухі, у іх вочы, якія свецяцца шчасцем, у іх адухоўленыя аблічы, непаўторныя і прывабныя рысы, адзначаю гэты шлюбны саюз як адно супольна-арганічнае, гарманічнае цэлае і кажу: давайце захапляцца прыгожымі людзьмі, любавацца імі, цешыцца разам і гаварыць ім шчыра, ад сэрца словы шаны і любові. Не трэба баяцца быць свабоднымі ў сваіх пачуццях. Давайце схіляць галаву перад яе вялікасцю Красой і прызнавацца сабе, людзям: вось яно, хараство, вось яно, дзівоснае, цудоўнае. Памятаеце: краса ўратуе свет. У гэтыя святочныя хвіліны радасць вялікая ў мяне на сэрцы: новая маладая сям’я прыгожыць наша жыццё. Прыгожых вам думак і пачуццяў на ўсё жыццё, прыгожых і слаўных дзетак. Ідзіце, крочце па жыцці разам і поруч сто гадоў! У добры шлях!»

Цяпер Светка перайшла на Толікава прозвішча і, згодна з народна-традыцыйнай завядзёнкай, развіталася з дзявочым мінулым і перабегла масток у новае жыццё. Але ўсё роўна Толік называў абранніцу сэрца па-ранейшаму, гэта значыць, маючы на ўвазе яе дзявочае, дазамужняе прозвішча. Казаў пяшчотна, замілавана, ды не мовіў, уласна кажучы, а спяваў лірычны ўзнёслы гімн кахання: «Мая Харашулінка, малінка-красулінка...» У сваіх пачуццях ён быў на дзіва шчыры, адкрыты, чулы ў абыходжанні — і, здавалася, неяк не зусім па-мужчынску далікатны і ласкавы, — не баяўся гэтых вонкавых праяў сваёй натуры. Цяпер, апрача гэтага, Толік пры нас звяртаўся да жонкі падкрэслена пашанотна, аддаючы перавагу перад ёй, сваёй багіняй: «Мой Светач».

Наш сябар выбраў красуню з красунь, скарыў яе сэрца, і, здавалася, яны, маладыя і прыгожыя, паядналіся праз вялікае каханне да скону. І будуць жыць душа ў душу так, як дай Бог кожнаму. Праўда, стараста групы Марына і адна з Толікавых уздыхальніц, канцэнтруючы ў ЗАГСе пільны погляд на незямной прыгажосці нявесты і прагна з'ядаючы яе вачыма, з рэўнасцю шапнула мне на вуха, бо ёй дужа карцела кальнуць нашага сябра, а мо і казала з такім прыцэлам, каб потым перадаў яе слоўцы: «Слаўна, хвацка падчапіў наіўную дзевачку. Нібы кот-ласанька бліскучую рыбінку з акварыума». І яшчэ былая Толікава пасія не ўтрымалася і выказалася са скепсісам, досыць іранічна-паблажліва: «Хараство часам розум слепіць. Святы наіў свет загубіў». Гэта дужа кантраставала з пафасным прамаўленнем нашага куратара дацэнта Забеліча, які за вясельным сталом заклікаў любіць прыгожых людзей.

Толік пасля вяселля затрымаўся ў інтэрнаце ненадоўга: мо на тыдзень ці трохі больш, знайшоў па абвестцы пакой у кватэры на ўскрайку горада, куды з'ехаў са сваім дэмбельскім чамаданам і гітарай у руках: зразумела, які скарб можа быць у студэнта. Хаця не, скарб усё-такі невялікі быў: гэта дзясяткі з тры кніг і некалькі песеннікаў, у адным з якіх на тытульнай старонцы меўся надпіс вядомага хормайстра, зроблены на ўспамін Толікавай маці. Па просьбе сябра мы з Рычардам праз нейкі час адвезлі туга перавязаныя стосы кніг на кватэру, дзе досыць сціпла часова асталявалася маладая сям'я. Трохі пасядзелі, пачаставаліся, пагаманілі. Толік на адвітанне пад гітару задушэўна-цёпла спяваў, пяшчотна гледзячы ў вочы сваёй Святланкі:

Толькі з табою мне хочацца быць,
Толькі з табою,
Радасць, і гора, і шчасце дзяліць,
Толькі з табою…

Матэрыяльна маладой сям'і дапамагалі бацькі — і Толіка і яго жонкі, аднак наш сябар меў пачуццё мужчынскай адказнасці, таму поруч з новым месцам жыхарства пайшоў працаваць у школу, дзе знайшліся гадзіны, паколькі настаўніца пайшла ў дэкрэтны адпачынак, а ў яе было аж паўтары стаўкі. Так сямейная пара нашых сяброў і кватаравала ў новым мікраараёне да канца вучобы Толіка. Бачыліся мы з ім выключна на занятках, у час залікаў і экзаменаў, кожны, а найбольш Толік, быў чымсьці заняты сваім і заўсёды спяшаўся, наогул не выпадала слоўцам перамовіцца. На апошнім курсе мы з Рычардам таксама знайшлі свае палавінкі, ён ажаніўся з дзяўчынай-медсястрой, а я нагледзеў сабе абранніцу на два курсы ніжэй — гэтак, як і Толік.

…І вось прабегла, праляцела гэтулькі часу. Мы з Рычардам дажылі да сваіх пяцідзесяці, прычакалі ўнукаў. А Толіка больш як год таму раптоўна не стала: паводле чутак, памёр ад сардэчнага прыступу. Даведаліся пра яго адыход з гэтага свету запозна, і то дзякуючы таму, што Рычард выпадкова ў падземным пераходзе сустрэў нашага аднакурсніка Васіля Каленчыца, які і паведаміў пра смерць Толіка, а што да чаго — ён і сам толкам не ведаў. Жыў на радзіме, раптам спынілася сэрца, пахавалі — вось і ўсё. Гэта ўжо потым Рычард неяк змог адшукаць нумар тэлефона Толікавай сястры, з якой ён раней камунікаваў і ведаў яе дакладны адрас у сталіцы. Яна была старэйшай за брата на чатырнаццаць гадоў, прыйшла на свет у канцы 1940-х, цяпер цяжка хварэла. Менавіта сястра Тамара некалі першай выйшла на Рычарда, калі з Толікам здарылася бяда: ён з пахмелля выпіў нейкай спіртавой вадкасці-атруты — і потым пачаў слепнуць. Тады ад сястры Рычард уведаў нямала, пачуў такое, што яго мо лепш было б і не чуць, і не ведаць…





Васіль Казачок

# ЗОРКІ МОЎЧКІ МОЛЯЦЦА

*Вершы*

***Казачок Васіль Андрэевіч*** нарадзіўся 30 ліпеня 1956 года ў вёсцы Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Гараднянскай СШ (1973) служыў у войску. Вучыўся ў Брэсцкім педінстытуце (1977—1982) на філфаку (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры). Працаваў у Гараднянскай сярэдняй школе настаўнікам роднай мовы і літаратуры. З 2018 года — загадчык Цэнтра ганчарства ў вёсцы Гарадная. Аўтар паэтычнага зборніка «Прызнанне» (2018).

## ВЯСНА

Снягі сплываюць. Ярка шчодрыць сонца.
Зямля дасніла свой зімовы сон.
Вясна прастуе. Доўгі і бясконцы
Зімы панылай скончыўся палон.

Гукае шпак на ліпе: «Я вярнуўся!
З краін паўднёвых вам прынёс цяпло!»
Ладуе для каханай мудры бусел
Каторы дзень утульнае жытло.

Пяшчотай лашчыць твары цёплы вецер:
Ён з сонцам і вясною заадно.
І першым громам радасна прывеціць
Нябёсаў прасвятлелае акно.

Кахаць жаданне распрамляе крылы,
Любіць жыццё, нібыта ўпершыню.
Тварыць дабро, пакуль пульсуюць сілы,
На новую ўздымацца вышыню.

ПРОЗА

# Дзмітрый Аўчыннікаў
# ФОТА НА ПАМЯЦЬ

*Апавяданне*



***Аўчыннікаў Дзмітрый Ігаравіч*** нарадзіўся 18 чэрвеня 1990 года ў Рызе. Жыве ў Расіі ў Новасібірску. Дзяцінства прайшло на Брэстчыне. Скончыў Сібірскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі. Працуе ў Арбітражным судзе Новасібірскай вобласці. Друкаваўся ў часопісе «Маладосць» і ў альманаху «Першацвет». У «Полымі» друкуецца ўпершыню.

Дзіўная справа: чаму некаторыя падзеі, якія здараюцца ў нашым жыцці, часам становяцца для нас настолькі важнымі ды значнымі, што мы памятаем пра іх нават праз досыць працяглы час. А бывае, памяць захоўвае іх да самага скону. Нават калі яны не маюць непасрэднага дачынення да нашага цяперашняга жыцця.

◆ ◆ ◆

Вясёлы, бесклапотны юнак, я тады ганарліва насіў званне студэнта БДУ ды толькі рыхтаваўся ўступіць у дарослае, самастойнае жыццё. Насамрэч, што такое дваццаць гадоў? Можна сказаць, нічога. Nihil. Асабліва для мужчыны, які, як вядома, сталее да гадоў сарака, калі не пазней. А нехта ўвогуле кажа, што мужчыны ўсё жыццё застаюцца дзецьмі, толькі цацкі з часам мяняюцца. Доля праўды, мне здаецца, тут дакладна ёсць.

Родам я з Берасцейшчыны. Нарадзіўся і да дзесяці гадоў жыў у Целяханах, потым мы пераехалі ў Брэст. Па сутнасці, Целяханы — гэта вёска, хаця фармальна называецца «поселок городского типа». І мы, адпаведна, не нейкія калгаснікі, а гарадскія. Смешна. А яшчэ больш смешна, што некаторыя целяханцы нават Пінск, вялікі райцэнтр, часам пагардліва называюць вёскай, а свае Целяханы лічаць амаль цэнтрам Сусвету.

Дзяцінства прынята атаясамліваць з самым шчаслівым, светлым перыядам жыцця. Калі запытаць у якога-небудзь чалавека сталага ўзросту, які час ён

лічыць найлепшым, то, хутчэй за ўсё, ён дасць менавіта такі адказ. Нават у тым выпадку, калі de facto ягоныя дзіцячыя гады былі не такімі ўжо і цудоўнымі. Гэта проста псіхалогія. Але ў маім выпадку дзяцінства сапраўды было светлым і бестурботным: гуляў з суседскімі хлопцамі ў футбол, катаўся на ровары, даглядаў нашых курэй, купаўся ў мясцовым возеры.

Яшчэ была вучоба. Не магу сказаць, што быў круглым выдатнікам, ці, як кажуць, батанікам. Не, звычайны сярэдні вучань, без асаблівых талентаў. Хіба што старанны, сціплы ды паслухмяны. Аднак часта так бывае, што рэпутацыя чалавека не надта адпавядае таму, што ён уяўляе з сябе насамрэч. Амаль як у Ясеніна: «Прокатилась дурная слава, что похабник я и скандалист». Ну, дапусцім, з Ясеніным збольшага так і было, але я дагэтуль не разумею, чаму, за кошт чаго я набыў славу хіба не самага разумнага ў нашым класе, у якога пастаянна прасілі спісаць аднакласнікі, а настаўнікі ставіліся вельмі прыязна, можна нават сказаць, па-роднаму, і часта, мне здаецца, ставілі не зусім справядлівыя адзнакі. Напрыклад, па фізіцы я стабільна атрымліваў адны пяцёркі, аднак, па шчырасці, выдатна я гэтую фізіку ніколі не ведаў. Як і хімію. Зрэшты, я за гэта на іх не крыўдую. Наадварот, я да сваіх настаўнікаў заўсёды ставіўся з вялікай павагай і ўсё жыццё буду ім удзячны за тое, што яны мне далі.

Пасля школы я паехаў пакараць сталіцу. Паступіў у БДУ на філалагічны факультэт. Чаму менавіта на філфак? Ну, тут усё проста: з дзяцінства бацькі прывучылі мяне да чытання, асабліва маці, якая спачатку чытала мне вершы для дзяцей і казкі, а потым давала кнігі, каб я чытаў самастойна. Вядома ж, што наша жыццё ў значнай ступені залежыць ад таго, што ў нас укладваюць у самыя першыя яго гады. І ролю бацькоў тут цяжка пераацэніць. Мне з бацькамі яўна пашанцавала. Яны заўсёды пра мяне клапаціліся і рабілі ўсё магчымае, каб у мяне было ўсё, што хачу. Маці, настаўніца ў сярэдняй школе, займалася маім культурным выхаваннем, і, можна сказаць, ёй удалося пасеяць ува мне «разумное, доброе, вечное». Бацька атрымаў у свой час інжынерную адукацыю, якая напачатку 90-х аказалася не самай запатрабаванай і грашовай. Падаўся ў бізнес. Бізнесоўцы тады ўспрымаліся як нешта новае, незвычайнае, дзівакаватае. Але ў той час гэта быў лепшы шлях зарабіць грошы для сябе і сваёй сям'і. Праўда, і не было тады больш небяспечнай прафесіі, чым бізнесовец. Шмат каго з татавых калегаў тады знайшла славутая бандыцкая куля. Але яму неяк пашанцавала.

Вучыўся я добра і, шчыра кажучы, без вялікіх цяжкасцей. Так, трэба было шмат чытаць, ды некаторыя выкладчыкі былі вельмі жорсткімі ды патрабавальнымі, але яшчэ са школы ў мяне сфармавалася звычка вельмі адказна ставіцца да сваіх вучнёўскіх абавязкаў. Апроч таго, і бацькоў не хацелася расчароўваць, якім я быў так шмат абавязаны.

Быў, праўда, адзін цікавы нюанс.

Як вядома, філфак — гэта даволі спецыфічнае месца, своеасаблівае жаночае царства. Напрыклад, у сваёй групе я быў адзіным хлопцам сярод дваццаці вельмі прывабных дзяўчат — сапраўднае выпрабаванне для маёй нервовай сістэмы. З аднаго боку, ясная рэч, мне было прыемна, чаго хаваць. А з іншага — трохі няёмка. Я адчуваў сябе адзінокай маленькай выспай або караблём у бяскрайнім моры, што, натуральна, не пасавала маёй душэўнай раўнавазе.

Адам Глобус

# СТАНОЎЧЫЯ ГЕРОІ

*Эсэ пра характары*

*Прысвячаю філосафу Феафрасту*

## Карпейчык і сур´ёзнасць

Сур'ёзнасць, размова з сур'ёзным чалавекам, сур'ёзныя справы заўсёды ўхваляліся Аляксандрам Карпейчыкам. Ён не проста адказна ставіўся да сур'ёзнасці, ён яшчэ вёў змаганне з іронікамі, з тымі, хто насміхаўся са шчырасці, з навуковасці, з дзяржавы і ўлады. Асабліва раздражнялі Аляксандра людзі пыхлівыя і сябелюбцы, што хаваюцца за тэатральнымі самапрыніжэннямі. У маладосці Карпейчык займаўся навукай, вывучаў глебы, пісаў дысертацыю па глебазнаўстве, ды здольнасцяў стаць сур'ёзным навукоўцам яму не хапіла. Ён сумленна ацаніў сябе і пайшоў настаўнічаць у звычайную школу, дзе выкладаў батаніку, заалогію і біялогію. Болей сур'ёзнага чалавека, чым школьны настаўнік Аляксандр Карпейчык, я не сустракаў на сваіх шляхах. Больш за дваццаць гадоў адпрацаваўшы ў школе, ён ні разу не спазніўся на ўрок... Для сур'ёзнага чалавека вучэбны працэс, як і навуковая дзейнасць, — найважнейшыя заняткі чалавека... Прынамсі, так думаў і казаў Карпейчык. Праўда, для Аляксандра ўсе заняткі былі сур'ёзнымі. Нават выбар сабе абутку і выбар сукенкі для каханай жанчыны ён рабіў сур'ёзна, удумліва, з веданнем справы. Асноўнай жыццёвай справаю Карпейчык называў пошук сур'ёзных людзей для сур'ёзных размоў. З сур'ёзным чалавекам ён мог прагаварыць цэлую ноч, каб на золку апрануць пінжак і спакойна паехаць у школу, там пакарміць акварыумных рыбак і весці ўрокі.

## Сарока і суворасць

Гэта ж так натуральна — ліслівіць і дагаджаць. Так практычна і перспектыўна. Ты пахваліў і цябе пахвалілі, ты лайкнуў і цябе лайкнулі, ты лізнуў і табе далі цукерку, далі булку, далі грошы, далі кіраўніцтва... Сядзі, кіруй і дагаджай магутным і заможным. Таму ліслівасць зрабілася нормай, а шчырасць і суворасць ссунуліся на маргінэс, на край і ў нібыта адмоўнасць. Несправядліва гэтае ссоўванне суворасці ў цень. Бо без шчырасці і суворасці не будзе праўдзівасці ды ісціннасці. Бо запануюць ліслівыя нягоднікі. Бо чалавечы свет зробіцца гідкім... Таму я згадаю суворага чалавека, які зімою насіў авечы кажух на голым торсе, а пад тым кажухом сядзела малпачка. Звалі суворага чалавека Кастусь Сарока. Меў ён майстэрню ў пераробленай грамадскай прыбіральні, што стаяла ў Мінску за Палацам спорту. У той майстэрні суворы Сарока рабіў скульптуры. Калі зробленае не падабалася скульптару, ён без шкадобы кідаў скульптуру на цэментавую падлогу, і тая развальвалася на кавалкі. Сарока

любіў віно, любіў жарты, любіў праўду. Калі нехта пры ім пачынаў ілгаць, Кастусь Сарока мог гучна перднуць і так агучыць сваю нязгоду. Суворы Сарока пражыў кароткае жыццё сапраўднага кініка. Хлуслівы свет паспрабаваў забыць шчырага і праўдзівага Кастуся Сароку, але не атрымалася, бо свету патрэбны суворыя героі, а скульптар Сарока адзін з іх.

## Хадыка і цішыня

Ёсць вершыкі крыкуноў, ёсць куплеты гарланістых заклікантаў, ёсць рыфмоўкі заангажаваных у палітыку енчылаў і галёкалаў, ёсць пёсэнкі сацыяльна актыўных верашчалаў. Чым больш жыву паэзіяй і ў паэзіі, тым далей адыходжу ад верашчалаў і галёкалаў, ад енчылаў і заклікантаў. Крыкуны раздражняюць, бо не маё. Што застаецца? Спакой, ціша, маўчанне... У лірыцы мусібыць і цішыня, чым яе больш, тым лепш ты чуеш: як скача жабка ў стары стаў, як у паветры шархочуць крылцы матылька, як з далёкага далёка гучыць парада твайго настаўніка Алега Хадыкі, якога даўно няма сярод жывых.

## Анемпадыстаў і выхаванасць

Грубіянаў і нахабнікаў, хамуйлаў і паскуднікаў, хаблоў і жлабоў так шмат, што хоцькі-няхоцькі паверыш у эвалюцыю, выкладзеную Дарвіным, і пагодзішся з тым, што чалавечага ў чалавеку зусім мала, а жывёльнага шмат. Зразумела, што чалавека ў чалавеку трэба вырошчваць, яго трэба выхоўваць. Ці шмат каго з нас можна назваць добра выхаваным? Не... Я не адразу сярод знаёмцаў знайшоў чалавека, які вылучаўся б менавіта выхаваннем. Як той казаў, хто шукае, той і знойдзе. Сярод кандыдатаў на асобу з выбітным выхаваннем перамог Міхал Анемпадыстаў. Ён не проста меў добрае выхаванне, а і культываваў яго. Які ты мастак, калі не можаш стылёва апрануцца? Які ты гаспадар, калі ў тваёй кватэры не зроблены рамонт, а ў майстэрні пануе пані Непрыбранасць? Які ты чалавек, калі не можаш папрасіць прабачэння за свае памылкі? Міхал апранаўся стыльна. Ягоная кватэра была адрамантаваная. Ягоная майстэрня ззяла пасля прыборак. Ягоныя прабачэнні прымалі з лёгкім сэрцам, бо Міхал умеў выбачацца шчыра. Ён і ад іншых патрабаваў шчырасці ў выбачэннях. Каб выхаваць сябе, трэба выхоўваць іншых. Міхал выхоўваў: рабіў заўвагі, паказваў памылкі, расказваў пра недарэчнасці і глупствы. Будзьма шчырымі, не ўсім падабаўся настаўніцкі тон дызайнера Міхала Анемпадыстава, але гэта не замінала яго любіць і паважаць.

## Мулявін і свабодалюбства

У прафесіі артыста ёсць адна складаная, на мой розум, дэталь. Артыст шмат каму павінен дагадзіць. Тут табе і шматлюдная аўдыторыя, якой ён мусіць спадабацца; тут і прыдумкі рэжысёра, якія ён не можа праігнараваць, тут і забабоны кампазітара, тут і фантазіі касцюмераў, тут і пэндзлі грымёршы, тут і загады асвятляльнікаў... А прадзюсар?.. А фундатар?.. А кіраўнікі розных узроўняў з кіраўніцамі рознакаліберныі?.. А... А-а-а... А-а-артыст дагаджае, дагаджае і дагаджае... Сыпле кампліменты... Схіляе галаву... Усміхаецца... Зда-

ецца, што ў прыродзе артыста закладзена здатнасць дагадзіць… Здаецца, што не можа існаваць такога артыста, які не дагаджае… Здаецца, я ўжо згодны пагадзіцца з гэткай высновай, але ў апошні момант я згадваю некалькі сустрэч з Уладзімірам Мулявіным і скажу: ёсць артысты спакойныя ў сваёй велічы, ім не трэба нікому нічога даводзіць, ім не трэба нікому дагаджаць. Яны, як той Уладзімір Мулявін, згодныя на пабытовы мінімум для сябе. Згодныя жыць у інтэрнацкім пакоі. Згодныя самі гатаваць сабе яечню. Згодныя захоўваць у душы свабодалюбства. Вялікі музыка Уладзімір Мулявін — свабодалюбца; і гэта вызначальная рыса ў ягоным складаным характары.

## Танк і разумнасць

Адчай, апантанасць, бажавольнасць заўжды жылі ў гуртках паэтаў. Што гэта за вагант, які не спявае песню для вар'ятаў смелых? Што гэта за рыфмач, які не засвяціўся ў показках пра скандалы, пра п'янства і бойкі? Што можна сказаць пра паэта разумнага, разважлівага, спакойнага? Ці ёсць такі? Ёсць… Аднаго такога я ведаў. Гэта наш Максім Танк. Праўда, чытаючы ягоныя выдатныя дзённікавыя запісы, можа падацца, што Танк больш палітык, чым літаратар, больш чыноўнік, чым лірык, больш разумнік, чым летуценнік… Нават калі яно так і ёсць, і Максім Танк сапраўды разумнік, чыноўнік і палітык, дык і ў такой сваёй якасці ён зрабіў шмат для радзімы. Зрабіў значна болей за літаратурных блазнаў і пісак-скандалістаў. Я не стану шкадаваць беларускую літаратуру, якая шмат страціла праз тое, што яе таленавіты сын процьму часу празаймаўся чынавенскімі справамі і палітычнай кар'ерай. Танк і для літаратуры зрабіў багата і нават у самы атэістычны час змог напісаць, надрукаваць і праспяваць верш Ave Maria.

## Цішын і маўчанне

Цішын таму і Цішын, што шмат маўчыць. І прафесію абраў ціхамірную і маўклівую — мастак. Навокал крыклівы, гаманкі і буркатлівы, мармытлівы і гаваркі свет. На першы погляд усе толькі тое і робяць, што выступаюць і спрачаюцца, задаюць пытанні і адказваюць, пераконваюць і аспрэчваюць адно аднаго. Тых, хто маўчыць, мала. Гарлапанства навідавоку, а маўчанне ў цяню, але яно каштоўнае. Менавіта пра яго кажуць: маўчанне — золата. Маўчуноў паважаюць. Цішына паважаюць, бо лішняга не кажа, бо падумае перад тым, як нешта казаць, бо ўсміхнецца перад тым, як загаварыць. Ёсць яшчэ і такое народнае: «Маўчы, дурань, за разумнага палічаць!» Гэта не пра Ігара Цішына, бо ён разумнік. Ягонае маўчанне напоўнена паэзіяй, якую Ігар вялікімі літарамі піша на карцінах і маленькімі літарамі выпісвае ў эсэ. Мянушка ў Ігара — Гірка, бо разважлівы, бо ўзважвае на языку кожнае слоўца і, узважыўшы, можа прамаўчаць. Маўчуну Цішыну можна даверыць сакрэт, бо вялікая верагоднасць таго, што ён яго захавае, а не раскажа абы-дзе і абы-каму. Апошняе, што тут скажу: з маўчуном, такім як Гірка, добра выпіваць. Звычайна мужчыны п'юць і гавораць несупынна, збольшага вярзуць лухту, а варта і памаўчаць, прыслухацца да сябе, паслухаць хмельную цішыню…